# §6 Сінтаксіс і пунктуацыя

Падрыхтаваў Мітрук Антон, вучань 8 «В» класа; ГУО гімназіі н.6 г.Брэста
Імя Жукава Г.К.

*Сінтаксіс* - раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца словазлучэнні і сказ: іх будова, значэнне, роля ў маўленні

# Чаму нам варта ведаць тэму сінтаксіс:

- вывучэнне сінтаксісу садзейнічае развіццю маўлення, таму што дапамагае правильна будаваць сказы, выбіраць выразныя віды словазлучэнняў і сказаў, якія найбольш адпавядаюць патрэбнаму ў дадзенай сітуацыі стылю маўленняведанне будовы і значэння сінтаксічных адзінак служыць асновай для фарміравання ўмення лагічна выражаць думкі, а таксама правільна расстаўляць знакі прыпынку

*Пунктуацыя*- раздзел навукі аб мове, у якім вывучаецца сістэма знакаў прыпынку і іх ўжыванне ў пісьмовым тэксце

# Чаму нам варта ведаць тэму пунктуацыю:

-знакі прыпынку дапамагаюць дакладна перадаць на пісьме свае думкі і пачуцці, а пры чытанні — зразумець тэкст і выразна прачытаць яго

# Пунктуацыя ў гісторыі

У старажытным тэксты запісвалі без прабелаў паміж словамі і сказамі, без знакаў прыпынку. Чытанне запіса было марудным і складаным. Каб палегчыць яго, трэба было перш за ўсё адзначыць межы сказаў, так і з’явілася кропка - першы і асноўны знак чляннення тэксту. На аснове кропкі паўсталі іншыя знакі: пытальнік і клічнік, коскі.

# Сінтаксіс цесна звязаны з марфалогіяй

*Чаму ?*

Сінтаксіс цесна звязаны з мрафалогіяй - другой самастойнай часткай граматыкі.

- Сувязь паміж сінтаксісам і марфалогіяй праяўляецца ў тым, што часціны мовы выконваюць функцыю пэўных членаў сказа: назоўнік найчасцей ужываецца ў ролі дзейніка і дапаўнення, прыметнік-у ролі азначэння
- Марфалігная форма слова абмоўлівае яго сінтаксічную функцыю, вызначае характар адносін слова з іншымі словамі ў межах словазлучэння і сказа

# Словазлучэнне /сказ

Словазлучэнне — гэта спалучэнне некалькіх слоў, звязаных падпарадкавальнай сувяззю (адзін кампанент залежыць ад другога): цёплае надвор’е, лагодны вецер, мяккі характар і інш

Сказ — гэта найменшая адзінка мовы (ці па-навуковаму *моўных зносін*), якая складаецца з аднаго або болей слоў й мае свае значэньне. На канцы сказа ставяць: кропку, шматкроп'е, пытальнік або клічнік.

# Адрозненне словазлучэнняў ад сказаў

| **Крытэрыі параўнання** | **Словазлучэнне** | **Сказ** |
|---|---|---|
| Асаблівасці будовы | Наяўнасць галоўнага і залежнага слоў:<br>я к о е? ш т о?<br>*роднае слова; вымавіць гук;*<br>я к?<br>*гучна размаўляць* | Наяўнасць граматычнай асновы:<br>*На роднай мове размаўляе мой слаўны, працавіты люд* (В. Шымук). |
| Асаблівасці значэння | Называе прадметы, дзеянні, прыметы больш дакладна, чым слова:<br>*слова — **важнае** слова;*<br>*слухаў — слухаў **прамоўцу**;*<br>*гаварыў — гаварыў **ціха*** | Выражае паведамленне (інфармацыю), пытанне ці пабуджэнне да чаго-небудзь:<br>1. *Восень. На вуліцы цёмна.*<br>2. *Ці плачу я, ці пяю?*<br>3. *Пакіньце мне мову маю, пакіньце жыццё мне!* (П. Панчанка). |
| Прызначэнне | Для спалучэння слоў і форм слоў у сказе | З'яўляецца сродкам зносін |
| Інтанацыя (для вуснага маўлення) | Не мае інтанацыйнай завершанасці | Мае інтанацыйную завершанасць |
| Пунктуацыя (для пісьмовага маўлення) | Не мае пунктуацыйнага афармлення | Мае пунктуацыйнае афармленне |

# Тыпы словазлучэнняў

Галоўнае слова + Залежнае слова

*Словазлучэнне*

*Іменнае*
Праэкт дома
Дарагі сэрцу
Пяць лыжак
Чымсьці вострым

*Дзеяслоўнае*
Расказаць казку
Пацямнелы ад загару
Баючыся холаду

*Прыслоўнае*
Сумесна з аўтарам
Позна вечарам
Утрая болей
Незвычайна хутка

# Паводле будовы словазлучэнні бываюць:

1. ***Простыя*** (**складаюцца з двух самастойных слоў**)
***шолах лісця***
2. ***Складаныя*****(уключаюць больш за два самастойных словы)**
***жанчына нізкаа росту***

# Не з’яўляюцца словазлучэннямі
**наступныя выпадкі**:

| | |
|---|---|
| Спалучэнне дзейніка і выказніка | *Дождж ідзе* |
| Назоўнік з прыназоўнікам, параўнальным злучнікам часціцай | *Каля дома; нібы кветка; толькі кветка* |
| Складаныя формы будучага часу дзеяслова | *Буду маляваць* |
| Складаная форма вышэйшай і найвышэйшай ступені параўнання якасных прыметнікаў і прыслоўяў | *Больш хуткі*<br>*Найбольш рашуча* |
| Састаўныя прыназоўнікі | *Нягледзечы на* |
| Састаўныя злучнікі | *Пасля таго як* |
| Загадны лад дзеяслова | *Няхай сяброе* |
| Аднародныя члены сказа | *Дуб і бяроза* |
| Састаўныя лічэбнікі | *Шэсдзесят пяць* |

# Віды сувязі слоў у словазлучэннях

**У словазлучэнні словы звязваюцца трыма відамі сувязі:**
**дапасаваннем, кіраваннем і прымыканнем**

## Дапасаванне –

**від падпарадкавальнай сувязі, пры якім залежнае слова набывае тыя ж граматычныя формы, што і галоўнае:**

*свежая **трава**, скошаная **трава**, першая **трава***
*(залежныя словы свежая, скошаная, першая маюць тыя самыя формы (адз. л., ж.р., Н. скл.), што і галоўнае **трава**)*

## Кіраванне –

**від сувязі, пры якім залежнае слова становіцца ва ўскосным склоне, якога патрабуе галоўнае.**
**Кіраванне бывае**
**беспрыназоўнікавым**
*(**паважаць** старэйшых)*
**і прыназоўнікавым**
*(**сустрэцца** з сябрам).*
**Пры змяненні галоўнага слова залежнае не змяняецца**
*(**помніць** пра Хатынь, **помні** пра Хатынь, **помню** пра Хатынь)*

## Прымыканне –

**від сувязі, пры якім нязменнае залежнае слова далучаецца да галоўнага па сэнсе.**
**Прымыкаюць прыслоўі, неазначальная форма дзеяслова, дзеепрыслоўі:**
*__вывучыць__ дасканала,*
*__жаданне__ сустрэцца,*
*__чытаць__ седзячы*

# Пытанні

Запішыце ў сшытках Варыянт 1 / Варыянт 2

## Практыкаванне 1

“Пазнай” паняцці па іх азначэннях

**Варыянт 1**

_____-раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца словазлучэнні і сказ: іх будова, значэнне, роля ў маўленні

**Варыянт 2**

_____-гэта спалучэнне некалькіх слоў, звязаных падпарадкавальнай сувяззю (адзін кампанент залежыць ад другога): цёплае надвор’е, лагодны вецер, мяккі характар і інш

Практыкаванне 2

На якое пытанне адказвае залежнае слова ў словазлучэнні?

Варыянт 1

Перадаць маці —
Убачыць праз акно
—

Варыянт 2

Твой запыт —
Ганарыцца сабой
—

Практыкаванне 3

**47.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып і стыль.

Знакі прыпынку і асноўныя правілы іх ужывання ўзніклі вельмі даўно, але асабліва пашырылася іх выкарыстанне пры вынаходстве[c] кнігадрукавання[c] і яго далейшым развіцці. Сёння нельга абысціся на пісьме ці пры друкаванні кніг без знакаў прыпынку, бо яны, падзяляючы тэкст на пэўныя часткі і словы, дапамагаюць хутчэй і лягчэй прачытаць напісаны або надрукаваны тэкст, правільна ўспрыняць, зразумець і перадаць яго іншым людзям. Важнае значэнне пунктуацыі відаць пры параўнанні сказа спачатку з апушчанымі, а потым з пастаўленымі знакамі прыпынку: *У хаце заставаўся дзед Купрыян Васілёў бацька і дзеці*. Без пастаноўкі знакаў прыпынку невядома, колькі дарослых было ў хаце — двое, трое ці чацвёра? У Якуба Коласа чытаем: *У хаце заставаўся дзед Купрыян, Васілёў бацька і дзеці*. Сказ са знакамі прыпынку стаў зразумелым *(Паводле дапаможніка «Беларуская мова»)*.

*Пракаментуйце*

Практыкаванне 4

Закончыце азначэнні

| Варыянт 1 | Варыянт 2 |
| --- | --- |
| Дапасаванне – гэта_____ | Прымыканне – гэта_____ |

# Адказы на пытанні

Варыянт 1

1.*Сінтаксіс*
*2.каму? праз што?*
*4. Від падпарадкавальнай сувязі,*
*Пры якім залежнае слова набывае*
*тыя ж Граматычныя формы, што і галоунае*

Варыянт 2

1.*Пунктуацыя*
*2.чый?кім?*
*4.від сувязі, пры якім нязменнае залежнае слова далучаецца да галоўнага па сэнсе*

Дзякуй за ўвагу!